УДК 826 - 32.09

**К.С. Карнялюк**

# Да пытання вывучэння праблемы часу ў навелістыцы Якуба Коласа

У навуковой літаратуры ўжо даўно тэарэтычна абгрунтаваны важнасць і перспектыўнасць вывучэння праблемы мастацкага часу ў творы [1, 2, 3]. Катэгорыя "часу" разглядаецца па-рознаму: як тэма, як аснова функцыянальных узаемаадносін (герояў, падзей, гісторыі). Нам думаецца, што аналіз часу найперш у гэтых ракурсах дазваляе глыбей і паўней зразумець своеасаблівасць мастацкага ладу твора. Аднак вывучэнне часу ў прозе выклікае значныя цяжкасці, якія абумоўлены спецыфічнымі асаблівасцямі эпасу.

Адразу адзначым, што ў Я.Коласа амаль няма навел, у якіх бы не прысутнічала вострае адчуванне часу – больш таго, катэгорыі часу ў яго складаюць самастойную, спецыфічную структурную адзінку. Яна ў празаіка з'яўляецца ўнутраным элементам, больш цесна звязаным з эстэтычным зместам, чым кампазіцыя, але разам з тым служыць ёй будаўнічым матэрыялам. У пісьменніка назіраюцца і такія асаблівасці, як праблематычнасць і перспектыва будучыні.

Функцыі часавых пластоў у яго апавяданнях выражаюцца ў тым, што на аснове праблематычнасці будучыні гучыць ідэя нацыянальна-вызваленчай актыўнасці і асуджэнне мінулых традыцый старога свету, якія валодаюць цяперашнім і могуць патрапіць у будучыню, калі яны не будуць пераадолены новым разуменнем жыцця і яго сэнсу. А перспектыва будучыні прысутнічае ў Коласа не толькі па сутнасці – у сэнсе ацэнкі гістарычнай і сучаснай рэчаіснасці, але і структурна – у апавяданнях, якія пераважна будуюцца на зрэзе цяперашняга часу, на перапляценні мінулага і цяперашняга ці на сюжэце ("Старасць не радасць", "Нёманаў дар" і іншыя).

Нам думаецца, што такое структурнае спалучэнне часавых планаў непасрэдна звязана са светапоглядам празаіка, які ўспрымаў нацыянальную рэчаіснасць актыўна, у перспектыве яе гістарычнага руху. Таму часавыя пласты выконваюць у яго апавяданнях важныя ідэйна-эмацыянальныя функцыі. Асабліва спецыфічным для Коласа з'яўляецца выдзяленне плана будучага часу, які ў сферы функцыянальнасці з'яўляецца носьбітам найбольш арыгінальных рыс эстэтычнага ідэалу. Аднак сцвярджэнне светлага, гуманістычнага ідэалу ў пісьменніка не дэкларатыўнае, а – у адпаведнасці з умовамі яго часу і формамі нацыянальна-вызваленчага руху – складанае і рэалістычнае. Адсюль, лічым, і ідэя праблематычнасці будучыні і неабходнасці барацьбы за сцвярджэнне сапраўдных чалавечых ідэалаў. І дададзім, што сам рух коласаўскіх уяўленняў пра час наглядна паказвае рост празаіка, своеасаблівасць яго шляху да рэалізму, да актуальнай тэмы радзімы і народа.

Апавяданне Я.Коласа часта спавядальнае, а час споведзі цяперашні. Разам з вобразам аўтара ў яго прозу ўваходзіць і час асабісты, які не толькі супастаўляецца з пазачасовым, вечным, але і супрацьпастаўляецца яму. Так, у апавяданні "Васіль Чурыла", якое заканчваецца трагічна, смерцю галоўнага героя, назіраем і вобраз "вечнага пакою": "І пачуў Васіль лёгкасць, як бы ён павіс над зямлёю. Ён ціха апусціўся, стаў лёгка, свабодна ўлазіць у нешта мяккае і халоднае. От як бы затрымаўся... Чуў ён яшчэ, як лопнуў рамень на стрэльбе, як улазіў уніз... Болей нічога не чуў Васіль. Вецер спяваў яму цяпер "вечны пакой" [4].

Вечнасць, як вядома, стабільная, нерухомая. Антыномія часавая існуе ў прозе Коласа паралельна з антыноміяй прасторавай. За гэтымі прасторава-часавымі антыноміямі празаіка праглядваецца і ўспрынятая ім ад расейскіх класікаў, з айчыннага фальклору канцэпцыя чалавека як спалучэння двух супрацьлеглых пачаткаў: бессмяротнага, духоўнага і смяротнага, матэрыяльнага. Аднак думка аб кароткачасовасці, канечнасці зямнога быцця чалавека нярэдка набывае ў пісьменніка і трагічнае асвятленне.

Трагічныя адносіны да свету і самога коласаўскага героя-селяніна, лесніка, які, разважаючы пра вечнасць і пра сябе, уяўляецца нам як чалавек драматычнага светаадчування: "Жыў чалавек на свеце, многа бачыў усякай прыгоды, не адно пакаленне прайшло перад вачыма старога Базыля, а прыйшла пара, і, здаецца, што ты як бы і не жыў на свеце, як бы ўсё гэта рабілася ў сне, бо ўсё злілося ў адну чорную пляму, якая вось-вось гатова патануць у багне прошласці... Адно чуецца ў гэтых думках – старасць, чуецца ў іх смутак, бо цяжка стаяць над магілаю свайго жыцця і пазіраць на яго развалiны" ("Старасць не радасць") [5].

Колас ужо ў ранніх апавяданнях ("Слабода", "Выбар старшыні", "Думкі ў дарозе", "Бунт" і інш.) намячае ацэнку свайго часу і агульнымі штрыхамі абмалёўвае воблік свайго пакалення – і такім чынам узнікаюць вобразы "сучаснікаў". Для празаіка – гэта пакаленне, якое пазбаўлена магчымасці гераічных подзвігаў на арэне агульнанацыянальных дзеянняў, а нярэдка і грамадзянскага значэння і сэнсу жыцця. Аднак у творах выразна бачна спроба суаднесці цяперашняе з мінулым і намаляваць абрысы будучага, якое ўяўляецца як эпоха, у якую знікнуць трагічныя супрацьлегласці сучаснасці і "ажывуць" лепшыя рысы нацыянальнага мінулага.

Але ж асноўным звяном у роздумах празаіка на нацыянальна-гістарычную тэму заўсёды застаецца цяперашняе, якое вызначаецца каляндарна канкрэтна. Каляндарнай датай адзначаны яго водгукі на актуальныя падзеі сучаснасці. Так, матэрыялам для апавядання "Бунт" паслужыў сапраўдны гістарычны факт: увосень 1905 года сяляне вёскі Пінкавічы Пінскага павета, дзе якраз у гэты час працаваў настаўнікам Я.Колас, пад уплывам рэвалюцыйнага руху

патрабавалі ад памешчыка С.С.Скірмунта значны кавалак зямлі і дазволу на права лоўлі рыбы ў двух памешчыцкіх азерах [6]. У апавяданні "Соцкі падвёў" дзейнічае член "саюза рускага народа", арганізацыі, якая была створана ў 1905 годзе для барацьбы з рэвалюцыяй. Апавяданне "Андрэй-выбаршчык" было напісана пад свежым уражаннем выбараў у трэцюю Дзяржаўную думу, якія адбыліся ў кастрычніку 1907 года.

Як бачым, побач з канцэпцыяй нацыянальнай гісторыі (успрынятай у суаднясенні з гісторыяй іншых народаў) у прозу Коласа ўваходзіць час гістарычны, каляндарна канкрэтны. Час асабісты у яго сапрагаецца з часам гістарычным. Апавяданні пісьменніка дакладна датаваны. Побач з часам самога аўтара з'яўляецца і час яго пакалення – гэта час асабісты, упісаны ў гісторыю, таксама каляндарна канкрэтызавана. І менавіта філасофска-гістарычным разуменнем сучаснасці, нам думаецца, у многім і вызначана трагічная танальнасць многіх яго апавяданняў.

Біяграфічны час коласаўскага пакалення ўпісваецца ў час гістарычны – канец XIX – І-я палова XX стагоддзяў. А каляндарная канкрэтнасць гістарычнага часу дасягаецца ў празаіка стварэннем кантэксту сучаснасці – эпохі палітычнага прыгнечання беларускага народа, і гэтая тэма ўводзіцца праз абмалёўку псіхалагічнага партрэта пакалення. Аднак драматызм лёсу свайго пакалення Колас тлумачыць не толькі прыгнечаннем, а звязвае і з гістарычнай бясчасавасцю, што выпала на долю яго сучаснікаў. Чалавек не вольны выбіраць для сябе эпоху: час біяграфічны супаў для яго пакалення з пераходнымі перыядамі ў нацыянальнай гісторыі. Час канкрэтна-гістарычны пры гэтым асэнсоўваецца па-філасофску: "І сядзіць ён, пакурвае старую люльку, абапершыся на кіёчак, і нешта думае, апусціўшы ў зямлю свае невідушчыя вочы. Аб чым жа ён думае? Можа, аб тым, што ён такі адзінокі і забыты, што ўсе яго таварышы даўно ўжо ляжаць пад крыжамі і толькі ён, як той стары падгніўшы дуб, растраціўшы сваё лісце, стаіць між зяленымі дубамі і ўжо не можа спяваць з імі ў адзін тон песню жыцця" ("Старасць не радасць") [7].

Праблема часу ў апавяданнях можа перарастаць у праблему прычыннасці. Гэты прычынна-часавы рад спецыфічны, але яго з'яўленне на беларускай глебе было вызначана грамадска-гістарычнымі заканамернасцямі нацыянальнай рэчаіснасці. І Колас паказвае сябе носьбітам "духу" нацыі, выразнікам гэтага "духу" у яго эпахальнай канкрэтнасці.

Лічым, што новае ўяўленне аб цяперашнім як пераходным перыядзе ў гісторыі абвастрыла ўсведамленне пісьменніка супрацьлегласці паміж вечным і пераходзячым. У яго апавяданнях бачны выразныя лініі пераемнай сувязі з ранейшымі творамі, у іх па-мастацку афармляецца тое, што выношвалася доўгі час празаікам, прабіваючца парасткі новага. Усё, што надае сэнс і значэнне жыццю селяніна, узводзіцца Коласам да вечных каштоўнасцей быцця. Пісьменнік не мог прымірыцца з тым, што час бязлітасна можа знішчыць многае – і ён высока шанаваў вечныя каштоўнасці быцця, але разумеў немагчымасць прыпыніць бег часу, лёс нацыянальнай гісторыі.

Час аўтара, час асабісты ў яго апавяданнях выразна спалучаецца з часам векавога жыцця беларускай прыроды і часам размеранага жыцця беларускіх мужыкоў, леснікоў, што праходзіла на ўлонні роднай прыроды. Аднак пры гэтым час блізкага да прыроды і падначаленага яго календару народнага жыцця атрымаў у Коласа асноўнае, стрыжнявое значэнне.

Аўтарскаму "я" часта ўласціва пачуццё гістарызму. Пры некаторай ідэалізацыі празаік добра ўсведамляе, што мінулае адышло назаўсёды, яго не вярнуць. Але вопыт Коласа-навеліста пакуль яшчэ не ведае, які станоўчы ідэал з сучаснай яму рэчаіснасці супрацьпаставіць мінуламу. Трагічная несумяшчальнасць рамантычнага ідэалу і сучаснай нацыянальнай рэчаіснасці

праяўляецца ў шматлікіх творах пісьменніка.

Толькі праз звяртанне да гераічнага мінулага Беларусі і можна было выразіць Коласу свой перадавы эстэтычны ідэал. Ад канонаў рамантызму празаік-рэаліст найбольш відавочна адступае ў суб'ектыўна-лірычным плане: свабодны не той, хто супрацьпастаўляе сваё "я" народу, а той, хто сваім жыццём, рэвалюцыйнай дзейнасцю садзейнічае росквіту роднай зямлі. Парушэнне Коласам традыцыйных канонаў рамантызму сказалася і ў тым, што само адмаўленне аўтарам носьбіта зла не носіць таго абсалютнага, максімалісцкага характару, як гэта мела месца ў творчасці рамантыкаў. Пісьменніку найперш хацелася ўбачыць гармонію паміж светам Беларусі і светам прыватнага жыцця чалавека, таму што і тое, і другое па-свойму цудоўныя. Але паколькі гэтая гармонія на пэўным гістарычным этапе неажыццяўляльная, а для Коласа на першым плане заўсёды былі інтарэсы Бацькаўшчыны, беларускага народа, яго "я" часта пагружаецца ў свет прыроды, звязваючы з ёй свой народны, патрыятычны ідэал.

Эстэтычны ідэал пісьменніка розных год творчасці меў свае асаблівасці, але аўтар пастаянна імкнуўся глыбей раскрыць канфлікт паміж ідэалам і рэчаіснасцю. Чым больш узвышаны быў ідэал Коласа-рамантыка, тым больш востры канфлікт з прозай сучаснай яму рэчаіснасці. І вельмі важна было паказаць, што вытокі аўтарскай мары не ў паднябессі, не ў падземным свеце, а ў гераічным жыцці народа, яго здаровай маралі. Апавяданні пісьменніка даюць магчымасць зразумець поўную ці частковую несумяшчальнасць ідэалу Коласа-рамантыка з гісторыяй Беларусі І-й паловы XX стагоддзя.

Такім чынам, дзякуючы пісьменніку, адбываецца паступовае мастацкае асэнсаванне адзінства Беларусі і гістарычнага лёсу яе народа. Я.Колас здолеў паглыбіць мастацкае адлюстраванне беларускай гісторыі і сучаснасці. У даволі кароткі тэрмін ён змог пераадолець характэрны для маладой айчыннай прозы разрыў паміж эпічнай (даўно пройдзенае, мінулае) і лірычнай (сучаснае) канцэпцыямі мастацкага часу. Класік роднай літаратуры стварыў нацыянальна непаўторны вобраз бацькаўшчыны, дзе, як і ў рэальным жыцці, арганічна спалучаны гісторыя і сучаснасць. Колас істотна ўзбагаціў мастацкі хранатоп твораў, значна пашырыўшы магчымасць эпічнага адлюстравання ў каардынаце часу, увёўшы матывы ўспамінаў, лірычныя адступленні. Нарэшце, коласаўскі эпічны хранатоп з'яўляецца ўзорам і для сучаснай айчыннай прозы, для жанру апавядання, бо, як лічыць даследчык Э.Шубін, навела – адна з вядучых форм пераходнага часу ў нацыянальнай гісторыі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Бахтин М.М.*** Эстетика словесного творчества. М.: Искусство, 1986, - 444 с.
2. ***Ларчанка М.Г.*** На шляхах да рэалізму. Мн.: Выд-ва БДУ, 1958, - 239 с.
3. ***Лейдерман Н.Л.*** Движение времени и законы жанра. Свердловск: Сред. Урал. кн. изд-во, 1982, - 254 с.
4. ***Колас Я.*** Зборнік твораў у 14 тт. Мн.: Мастацкая літаратура, 1973, т.4. С.45.
5. ***Там жа.*** Т.4. С. 96, 97.
6. ***Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці.*** Фонд 295, зв.9053, л.775.
7. ***Колас Я.*** Зборнік твораў у 14 тт. Мн.: Мастацкая літаратура, 1973. Т.4. С.97.


## S U M M A R Y


*The article considers the problem of time the in the novels by Yakub Kolas. This prose-writer presents the category of time as an independant, specific structural unit of works of fiction. The combination of different time planes is closely connected with the writer's world outlook. He apprehends the national reality actively and sees it through the perspective of its historical development. The prose by Kolas often includes concrete historical time measured by calendar.*